№ 183 (305)

Чацвер, 16 кастрычніка 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	7.30	18.00
Магілёў	7.27	18.04
Гомель	7.22	18.01
Мінск	7.38	18.12
Гродна	7.53	18.28
Брэст	7.51	18.31

Поўня 16 кастрычніка.

Не могу молчать

"Баста!" – говорят рабочие

"Мы, работники завода "Измеритель" г.Новополоцка, в ходе всенародного обсуждения проекта декрета Президента РБ "О неотложных мерах по повышению трудовой и исполнительской дисциплины" высказываем конкретные предложения.

1. Проект Декрета полностью отвергнуть как бестолковый и антинародный.

2. Восстановить действие Конституции РБ 1994 года, при которой появление декретов, тем более подобных данному, было в принципе невозможно.

3. Президенту РБ повышать эффективность производства не методом "закручивания гаек", что считаем бесперспективным, а проведением реальных экономических реформ, направленных на повышение материальной заинтересованности работников в результатах своего труда; а также не мешать своими действиями развитию экономических связей с Россией и остальным цивилизованным миром".

(Всего 183 подписи рабочих.)

Освобожден от занимаемой должности председатель акционерного общества закрытого типа "Рассвет" Кировского района Василий Старовойтов. Человек-легенда, дважды Герой Социалистического Труда, первооткрыватель реформ в сельском хозяйстве Беларуси...

Освобожден после слов, произнесенных Александром Лукашенко перед депутатами на прошлой неделе: "Снять с работы немедленно!"

Перед этим было сказано, что в "Рассвете" нет никакого учета, что там не убираются десятки гектаров зерновых... И вообще, вице-премьер В.Гаркун и министр сельского хозяйства и продовольствия В.Леонов пусть больше не рассказывают Лукашенко, что, мол, Старовойтов великий человек...

Кто великий, а кто нет — время покажет. А пока рьяные чиновники бросились выполнять указание — снимать с работы человека, которого может снять только собрание акционеров. Если, конечно, помнить о том, что, в принципе, существует хоть какие-то законы. Или хотя бы о том, что даже колхоз (не говоря уже об акционерном обществе) не является государственной собственностью. И, значит, государственные чиновники любого ранга, включая президентский, не могут решать кадровые проблемы путем указаловок.

Но такое возможно только там, где помнят о законах. А у нас... Как стыдливо сообщает местная газета "Могилевские ведомости", председатель райисполкома провел собрание со специалистами хозяйства, на котором объявил, что Старовойтов освобожден от работы, и назначил исполняющим обязанности председателя АОЗТ "Рассвет" Анатолия Белявского.

Для порядка арестовали зятя В.Старовойтова — почему-то, говорят, за хранение незарегистрированного оружия и боеприпасов.

Возбуждено уголовное дело по факту хищений в "Рассвете". Каких — не сообщается.

Означает ли все это, что окончилась легенда о великом (на взгляд автора, без всяких кавычек) Старовойтове? В отличие от исполнительных чиновников не будем спешить. Подождем, посмотрим... Может быть, она еще только начинается.

Во вторник дозвониться до В.Старовойтова автору этих строк не удалось, связь с квартирой не устанавливалась. Это в какой-то мере подтверждает слух о том, что известнейший руководитель, дважды Герой Соцтруда не просто снят с должности председателя АОЗТ "Рассвет", а находится к тому же под домашним арестом.

Анатолий ГУЛЯЕВ.

Комментарий

"Всеобщий любимец" с шашкой наголо против "своего избирателя"

Людмила МАСЛЮКОВА, политический обозреватель "Народной воли"

О грядущем бесправии госслужащих, инженеров и рабочих государственных предприятий "Народная воля" предупреждала общественность в номере за 10 июня 1997 года. Тогда еще я подвергла резкой критике раздобытый в кулуарах проект готовящегося декрета "О неотложных мерах..." в статье "Ну, чиновник, погоди! Двести тридцать пятая серия..." Выводы летней публикации, как показало время, совпали с осенним протестом работников завода "Измеритель".

Власть, желающая править с помощью штрафов, поборов, наказаний, пока лишь поигрывает кнутом. Для того чтобы загодя "выпустить пар", разрядить естественное возмущение простых людей, организовано так называемое "всенародное обсуждение" проекта.

Однако в некоторых трудовых коллективах предпочитают, как видите, выражать мнение, отличное от официального. Свой "приговор" дискриминационному декрету "Измеритель" прислал в "Народную волю". Реакция заводов на заигрывание с проектом понятна. Она резко отрицательна там, где трудовой люд смекнул, как глубоко "достанут" его драконовские правила об ужесточении так называемой "дисциплины".

Четыре листа подписей размером почти с нашу газетную страницу мы получили от одного из крупнейших предприятий города Новополоцка. Даже этот документ отражает оттенки в оценке ситуации. Он содержит 183 подписи, четыре из них с оговорками: "за п.1, с остальным не согласна"; "кроме п.2"; "с пунктом 2 не согласен"; "кроме п.2". Три автора особых мнений не замахиваются пока на право президента править страной с помощью декретов, один, выходит, не против и "закручивания гаек". Уважая право этих людей мыслить по-своему, не комментирую оговорки.

На одном из листов кто-то — по моему мнению, наиболее сообразительный из подписавшихся — внес поправку в характеристику декрета: вычеркнул определение "бестолковый" и оставил прилагательное "антинародный". Я разделяю эту позицию безвестного редактора. Декрет, конечно же, "толковый" с точки зрения интересов власти. Это инструмент для администраций, дирекций, правлений, властей, милиций и судов, с помощью которого будут совершаться массовые расправы с недовольными.

В случае введения декрета в действие он позволит затуркать, запугать, поставить на колени теперь уже всех поголовно. Декрет целенаправленно и осознанно антинародный. Мартовский декрет №5, принятый в период политической весны-96, был направлен против демонстрантов и касался тысяч граждан, прежде всего из числа активной оппозиции. Политическую осень-97 предваряет попытка власти перейти к широко масштабным запретам, которые коснутся миллионов. Вводимые ограничения прав "повяжут" людей непосредственно у станков и кульманов, в заводских цехах и на сельских фермах, на рабочих местах — чтобы не посмели и думать о выходе на улицы.

Запуск на орбиту этого проекта, кроме всего прочего, для власти саморазоблачителен. Затея доказывает, что Александр Лукашенко и его окружение прогнозируют, просчитывают и опасаются брожения на предприятиях, нарастания в обществе внутреннего протеста, усиления социального напряжения до уровней, небезопасных для правящего режима. Такого рода ограничительные декреты не принимаются с кондачка, они всегда решают сугубо практические назревшие актуальные политические проблемы. Рабочее движение еще только, простите за прямоту, расчухивается, а удавку на него верхи уже припасают.

Впервые в истории президентства А.Г.Лукашенко откровенно и цинично покушается на интересы массового избирателя, который и вознес его на вершину власти. Поперваx Александр Григорьевич еще разыгрывает свой обычный потешный спектакль — он якобы советуется со "своим народом". На самом деле он "советуется" ради того, чтобы половчее и без лишнего гвалта спустить с населения последнюю шкуру. Грозящие людям поборы выведут сотни тысяч рядовых белорусских семей за грань выживания.

Со времен президентских выборов 1994 года и двух лукашенковских референдумов 1995 и 1996 годов народ все же кое в чем поднаторел и не так слепо верит "своему любимцу". Во всяком случае, пробный замах шашкой наголо против себя люди ясно различили. Чем отчасти и ответили на вопрос, над которым я размышляла в публикации от 31 июля сего года под заголовком "Способен ли рабочий класс видеть дальше бутылки водки, куска колбасы и дачной грядки?". Вполне оказался способен, как только дело дошло до реальной угрозы получать жалкие остатки зарплаты, обрезанной противозаконными штрафами до непрожиточного минимума.

Политическое заявление Верховного Совета о наличии в действиях президента признаков преступления

Как и планировалось, 14 октября состоялось очередное заседание группы депутатов Верховного Совета 13-го созыва. В нем приняли участие 43 депутата с мандатами образца 1995 года. Основная проблема, по которой собравшимся предстояло принять решение, — выразить отношение к заключению специальной комиссии по правовой оценке нарушений президентом А.Лукашенко Конституции и законов Республики Беларусь. После довольно продолжительной дискуссии по актуальному вопросу депутатский корпус принял политическое заявление. В нем два наиболее значимых пункта. Первый — о согласии с выводами вышеозначенной комиссии, возглавляемой депутатом Виктором Гончаром. Пункт второй звучит так: "Признать невозможным исполнение президентом Республики Беларусь А.Лукашенко своих обязанностей..."

Впервые с момента раскола Верховного Совета 13-го созыва на оппозицию, "болото" и так называемую Палату представителей документ под названием "Политическое заявление" принят от имени всего парламента, избранного надлежащим образом и признанного европейским сообществом единственно легитимным законодательным органом. О подробностях события, его оценках и возможных последствиях газета расскажет читателям в ближайших номерах.

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

А што там на Віцебшчыне?

Лік даўгоў ідзе ўжо на сотні мільярдаў

Ніводнага рубля падаткаў не паступіла з пачатку года ў дзяржаўную казну ад калектыва аршанскай фірмы "Лёс" — выпадак, напэўна, беспрэцэдэнтны ў сусветнай эканоміцы. Пад размовай аб нейкай стабілізацыі не змяншаецца колькасць вытворцаў, якія не ў стане вытрымаць падатковы прэс. Так, на Віцебшчыне маюць запазычанасць перад бюджэтам 1113 юрыдычных асобаў і 449 прыдпрымальнікаў на агульную суму ў 162 мільярды рублёў, а яшчэ больш чым на 300 мільярдаў суб'ектам гаспадарання прадастаўлена адтэрміноўка плацяжоў. У вобласці нават склалася своеасаблівая дваццатка неплацельшчыкаў-мільярдэраў.

Гэты чорны спіс узначальвае цяпер акцыянернае таварыства "Орша", якое мае доўгу па падатках на суму 16,1 млрд. рублёў. Амаль нічога не ўнеслі ў казну таксама віцебскія завод "Мегом", АП "Візас", ВА "Электравымяральнік", завод "Вістон", навапалацкі завод "Вымяральнік", лік даўгоў якіх набліжаецца да 10 мільярдаў рублёў у кожнага. З правераных спецыялістамі падатковай інспекцыі з пачатку года юрыдычных асоб у кожнага другога з трох былі выяўлены тыя ці іншыя парушэнні заканадаўства.

Усё больш дарог да храма

Услед за ўзведзеным праваслаўным храмам цэнтр гарадскога пасёлка Варапаева ўпрыгожыў і манументальны каталіцкі касцёл. Яго папярэднік пасля вайны быў разбураны, а на святым месцы ўлады ўзвялі кінатэатр. Адроджаная святыня стала 44-ым па ліку касцёлам, які дзейнічае ў вобласці. Наогул, за апошнія пяць гадоў у рэгіёне ў два з паловай разы ўзрасла колькасць зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў і яна складае зараз 315 абшчын. Пераважае ў вобласці праваслаўная царква, якая мае 143 прыходы, аб'яднаныя ў дзве епархіі і два манастыры. Другой па колькасці з'яўляецца каталіцкая царква са сваімі 66 аб'яднаннямі вернікаў. А яшчэ ў вобласці дзейнічаюць 19 стараабрадчаскіх абшчын, 24 — евангельскіх хрысціян баптыстаў, 31 — пяцідзесятнікаў, чатыры мусульманскія, тры іудзейскія, дзве грэка-каталіцкія і нават суполкі лютэран і крышнаітаў. Пэўна, тое і добра, што ў цяперашнім цяжкім жыцці народ успомніў пра дарогу да Бога.

Падрыхтаваў Уладзімір ШЫК.

Пазіцыя

Шкада, што гэтай мужнасці не хапіла раней...

Артыкул С.Шарэцкага "Ложь. Лицемерие. Насилие...", надрукаваны ў "Народнай волі" 25 і 26 верасня, я прачытаў двойчы. Першы раз, як толькі прынеслі газеты, сам, а другі — разам з жонкай. А потым адбылося, так бы мовіць, сямейнае абмеркаванне.

З жонкай мы аднадумцы, але гэта не значыць, што яна адразу пагаджаецца з усім, што кажу я, і наадварот. За сорак восем гадоў сумеснага жыцця мы спакваля навучыліся галоўнаму — уважліва слухаць адзін аднаго, а ўжо потым выказваць свае думкі. Здараецца, што па нейкіх пытаннях не прыходзім да адзінай думкі.

Але пры чытанні артыкула С.Шарэцкага ніякіх разыходжанняў у нас не было. Таму ўсё, што ніжэй я буду выказваць як бы ад сябе, гэта на самой справе ад нас дваіх.

Першае, што я хацеў бы зрабіць, — гэта выказаць сваё захапленне мужнасцю аўтара за яго ацэнкі існуючага ў нас сёння рэжыму. Да іх, як кажуць, ні дадаць, ні адняць — усё абгрунтавана і справядліва.

Але не знайшоў я ў артыкуле адказу на пытанне, якое не можа не ўзнікнуць: ці толькі дзякуючы бессаромнаму парушэнню Канстытуцыі, махлярству і гвалту з боку прэзідэнта і яго хаўруснікаў здарылася тое, што мы сёння маем?

Ці ўсё было зроблена з боку паважанага аўтара на пасадзе старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, каб спыніць крымінальныя захады прэзідэнта на захоп усёй улады ў свае рукі?

За прайшоўшы час з трагічных для Рэспублікі Беларусь падзей лістапада 1996 года аўтар, як вынікае з артыкула, канчаткова акрэсліўся ў сваім перакананні — што з сябе як чалавек, як дзяржаўны дзеяч уяўляе наш прэзідэнт.

Але, напэўна, яшчэ не надышоў час, каб самакрытычна паглядзець на сябе як старшыню Вярхоўнага Савета, прааналізаваць свае дзеянні ў той складаны лёсаносны час лістапада 1996 года.

Гэты час абавязкова прыйдзе, бо, назіраючы за аўтарам з моманту абрання яго старшынёй Вярхоўнага Савета, нельга было не заўважыць у ім сялянскай мудрасці, памяркоўнасці, гатоўнасці шукаць кампраміс нават у самых безнадзейных сітуацыях.

Але ж ці заўсёды і з усімі трэба бясконца шукаць кампраміс? Можа, тады старшыня Вярхоўнага Савета не ведаў, з кім ён спрабуе дамовіцца? Хутчэй за ўсё — ведаў, бо чытаем у ягоным артыкуле такія радкі: "Став президентом, Лукашенко буквально в первые дни начал нарушать Конституцию и законы Республики Беларусь, потерял всякую скромность, присущую нашему народу". А калі так, то тады ў чым прычына?

Давайце вернемся ў тыя трагічныя лістападаўскія дні 1996 года. Прэзідэнт не хаваў сваіх намераў аб атрыманні неабмежаванай асабістай улады.

С.Шарэцкі, В.Ціхіня і В.Ганчар добра гэта разумелі і рабілі, як ім здавалася, усё, каб гэтага не дапусціць.

С.Шарэцкі накіроўваецца ў Маскву і Смаленск шукаць падтрымкі.

В.Ціхіня на пасяджэннях Канстытуцыйнага суда прызнае неканстытуцыйнымі шэраг указаў прэзідэнта.

В.Ганчар на ўвесь свет заяўляе, што вынікі рэферэндуму, калі ён будзе праведзены ў тэрмін і з такой фармулёўкай пытанняў, як хоча прэзідэнт, Цэнтрвыбаркам не прызнае.

У тых дэпутатаў Вярхоўнага Савета, каму не абыякавы лёс дзяржавы, выспявае думка, што прэзідэнта трэба адхіляць ад улады. Урэшце сабрана дастатковая колькасць подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савета, каб можна было ў Канстытуцыйным судзе разгледзець справу аб імпічменце.

Аб гэтым вядома прэзідэнту. Ён адчуў рэальную пагрозу і, не губляючы часу, прымае неабходныя захады. Яму патрэбен быў час для "апрацоўкі" дэпутатаў з ліку падпісантаў, каб яны адазвалі свае подпісы. Бо калі не будзе 70 подпісаў, то Канстытуцыйны суд не зможа прыняць да разгляду заяву аб імпічменце.

І прэзідэнт пачынае перамовы са старшынёй Канстытуцыйнага суда В.Ціхіняй, просячы яго адкласці разгляд справы аб імпічменце, каб, як ён казаў, падрыхтаваць свой адказ па спрэчных пытаннях.

Неверагодна, але добра ведаючы, дзеля чаго прэзідэнту спатрэбілася адтэрміноўка ў разглядзе справы аб імпічменце, В.Ціхіня дае на гэта згоду!

Вынік такога рашэння старшыні Канстытуцыйнага суда вядомы. І сёння ў першую чаргу адчуваюць яго на сабе С.Шарэцкі, В.Ціхіня, В.Ганчар — тыя, у каго, вобразна кажучы, у лістападаўскія дні 1996 года ў руках быў кантрольны пакет акцый на дэмакратычны шлях Рэспублікі Беларусь. І яны яго, прабачце, дапамаглі скрасці, уступіўшы ў перамовы, якія былі патрэбны толькі прэзідэнту, бо час працаваў на яго.

І гэта замест таго, каб у крытычны лёсаносны час рашуча і мэтанакіравана дзейнічаць, аб'яднаўшы свае сілы ў адзіны магутны кулак.

Я зноў хачу звярнуць увагу на адну істотную акалічнасць. Прынамсі, В.Ціхіня і В.Ганчар, асабліва апошні, добра ведалі, што з сябе ўяўляе прэзідэнт. Ведалі, што з ім нельга размаўляць так, як размаўляў кухар з катом у вядомай байцы І.Крылова.

Таму, калі б В.Ганчар замест шматлікіх заяў у сродках масавай інфармацыі аб сваіх намерах больш маўчаў і не раскрываў сваіх карт прэзідэнту, грунтоўна рыхтуючыся да рэферэндуму; калі б В.Ціхіня, атрымаўшы заяву з дастатковай колькасцю подпісаў дэпутатаў аб імпічменце прэзідэнту, адразу, не губляючы ні адной хвіліны, правёў пасяджэнне Канстытуцыйнага суда, — было б прынята рашэнне аб імпічменце.

Калі б С.Шарэцкі замест пошукаў падтрымкі ў маскоўскіх вялікадзяржаўнікаў выйшаў да людзей на плошчу, калі яны днявалі і начавалі там, і звярнуўся да іх не з просьбай разыходзіцца, бо падпісана дамова, гарантамі якой выступаюць прадстаўнікі Дзяржаўнай Думы Расіі, а папрасіў іх тэрмінова прывесці на плошчу сто, дзвесце тысяч мінчан, каб пры іх падтрымцы пайсці да тэлецэнтра і атрымаць магчымасць як старшыні Вярхоўнага Савета звянуцца па тэлебачанні да грамадзян Рэспублікі Беларусь і сусветнага супольства, адкрыта сказаўшы, што рыхтуецца дзяржаўны пераварот...

І Лукашэнка быў бы адхілены ад улады? Наўрад. Не такі чалавек Лукашэнка, каб выканаць рашэнне Канстытуцыйнага суда. Але яго дыктатарскім намаганням быў бы нанесены такі ўдар, які прымусіў бы яго адысці ў канстытуцыйнае прававое поле. А галоўнае — гэта ўмацавала б веру людзей у справядлівасць, чэснасць, непахіснасць і мужнасць С.Шарэцкага, В.Ціхіні, В.Ганчара.

І тады большасць дэпутатаў падтрымала б Канстытуцыю 1994 года.

Магу з упэўненасцю сказаць, што нават у глыбінцы шмат людзей чакалі, што менавіта ў такім накірунку будуць адбывацца падзеі.

Я паважаю мужнасць кожнага, хто сёння, нягледзячы на бессаромна сфабрыкаваныя судовыя справы і прысуды штрафаў астранамічных памераў, выказвае свой пратэст існуючаму рэжыму.

Шкада, што гэтай мужнасці не хапіла менавіта ў той момант, калі яна — гэтая мужнасць — была так патрэбна, якую чакалі тысячы, дзесяткі тысяч патрыётаў сваёй Бацькаўшчыны, што адкрыта выходзілі пад амапаўскія дубінкі, якую чакалі сотні тысяч тых, хто жадаў перамогі дэмакратыі, але па розных прычынах назіраў за падзеямі, стоячы побач.

Выказваючы свой погляд, я ні ў якім разе не хачу пакрыўдзіць у першую чаргу паважанага спадара Шарэцкага. Спадзяюся, што калі ў яго хапіла мужнасці адкрыта выступіць з такім артыкулам, ён з паразуменнем аднясецца і да ацэнкі сваёй дзейнасці на пасадзе старшыні Вярхоўнага Савета, зробленай адным з тых грамадзян Рэспублікі Беларусь, каму не абыякавы лёс сваёй Радзімы, а таму шчыра зычу яму толькі аднаго — моцнага здароўя, бо наперадзе чакаюць нялёгкія выпрабаванні.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

г.Слаўгарад.

Обращение совета Белорусской партии труда к трудовым коллективам, профсоюзным организациям, людям труда

В средствах массовой информации опубликованы основные положения Декрета Президента Республики Беларусь "О неотложных мерах по укреплению трудовой и исполнительской дисциплины" для обсуждения в трудовых коллективах, организациях, всеми гражданами Беларуси.

Характерным фактом для организации подобных мероприятий нынешними властями являются определенные ограничения:

на гласность — обсуждается не проект опубликованного документа, а только его основные положения, что не дает полного представления о декрете, социальной направленности его норм и категориях работников, на которых эти нормы распространяются;

на сроки обсуждения — в соответствии с установками, которые скорее всего получены сверху, ставятся очень сжатые сроки проведения собраний: в течение недели необходимо было сдать всем коллективам протоколы собраний, а кое-где требуют обязательного и всеобщего одобрения.

Все это напоминает очередную кампанию по "одурачиванию людей", как это было при досрочном голосовании за президентскую Конституцию, которую в подавляющем большинстве никто не читал. Создается впечатление, что власть хочет протащить удобный для них документ и создать видимость всенародного обсуждения.

Этого допустить нельзя!

Суть документа одна: дальнейшее укрепление авторитарного диктаторского режима.

Для любого грамотного гражданина ясно, что нет необходимости в подобном декрете. Есть Кодекс законов о труде, где в полной мере определена правовая основа трудовой и исполнительской дисциплины. Но власть не уважает Закон, а значит, и не умеет его исполнять, не умеет организовывать его исполнение.

Следует обратить внимание не структуру декрета. Есть несколько норм, которые как бы усиливают ответственность нанимателей за своевременность выплаты зарплаты и являются привлекательными для наемных работников. Но в целом основная направленность декрета — это ограничения прав и свобод человека труда, усиление его эксплуатации, очередная попытка сделать простого рабочего человека "козлом отпущения" посредством неграмотного, непрофессионального и амбициозного управления государством.

Совет Белорусской партии труда считает, что данный декрет достоин не обсуждения, а осуждения и не надо направлять мнение людей при его обсуждении в трудовых коллективах.

Совет БПТ считает, что если декрет будет подписан, то у людей труда остается один путь — массовые выступления против политического режима, который установлен в Беларуси.

Председатель Белорусской партии труда Александр БУХВОСТОВ.

2 октября 1997 года.

Демократия по-белорусски

Молодые "патриоты" наводят "порядок"...

В этот октябрьский день около 13.00 руководитель службы наблюдателей Белорусского Хельсинкского комитета (БХК) 21-летняя студентка Европейского гуманитарного университета Надежда N. вышла из канцелярии Ленинского суда Минска, где она пыталась получить сведения о судах над участниками акции 12 октября.

Близ канцелярии суда Ленинского района высокий широкоплечий мужчина в кожаной куртке, узнав, что Надежда является наблюдателем БХК, сообщил, что на улице стоят милицейские машины с задержанными. На улице Ленина в считанных метрах от здания суда стояли два белых "Опеля", один из которых был с милицейскими номерами. Из второго "Опеля" вышли двое мужчин в кожаных коричневых куртках, схватили девушку за руки, ударили в живот и повели в близлежащий двор, угрожая ножом. Во дворе они обыскали ее сумку, забрали удостоверение наблюдателя Белорусского Хельсинкского комитета и предупредили, пригрозив, что впредь присутствовать на массовых акциях и судах будет небезопасно. На вопрос Надежды, с кем она имеет дело, один из них небрежно бросил в ответ: "Молодые патриоты Белоруссии" и добавил: "Твое лицо мелькает на всех видеопленках". Затем оба сели в автомобиль и уехали.

Нападение на наблюдателя БХК мы расцениваем как начало преследования правозащитных организаций Беларуси. Мы обращаемся к государственным органам, общественным организациям помочь нам в проведении правозащитной деятельности. Преследование активистов правозащитного движения имеет целью сокрытие правды о нарушениях прав человека в Беларуси.

Пресс-служба Белорусского Хельсинкского комитета.

Стоп-кадр



Свято-Никольская церковь, которая была воздвигнута в Петрикове в 1830 году и сохранилась до сих пор, является единственным в своем роде архитектурным памятником на Полесье (построенные тогда же в Турове и Давид-Городке церкви были разрушены). Здесь один из лучших на Гомельщине церковный хор, действует воскресная школа, собрано много старинных икон, оставшихся в единственном экземпляре на Беларуси.

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

Паралелі

Да нас едзе прэзідэнт,

альбо Чаму кіраўнік даваеннай Польшчы Ігнат Масьціцкі быў бліжэй да народа, чым сённяшні прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка

Напачатку прыгадаю дзве падобныя, хоць і аддаленыя ў часе падзеі. У далёкім 1933 годзе Пастаўскі павет, які тады быў часткай Польшчы, наведаў на два дні яе тагачасны прэзідэнт Ігнат Масьціцкі. Праз некалькі дзесяцігоддзяў, а дакладней — напрыканцы жніўня бягучага года, у цяперашнім Пастаўскім раёне ўпершыню пабываў на працягу некалькіх гадзін першы беларускі прэзідэнт. Дзве гэтыя рабочыя паездкі кіраўнікоў дзяржаў далі багаты роздум для параўнанняў і вывадаў. Да таго ж мне якраз давялося сустрэцца з жывым сведкам абодвух візітаў высокіх асоб.

Хлапчуком сустракаў былы настаўнік, цяпер пенсіянер, картэж высокага госця з Варшавы з дзесятка аўтамабіляў. У памяці засталося, як з цікавасцю і гонарам, у прыўзнятым настроі ішлі людзі на тую сустрэчу, было вельмі шмат кветак. Дзеці віталі польскага прэзідэнта вершамі, за што атрымалі цукеркі. Пасля сустрэчы ў Варапаеве І.Масьціцкі застаўся заначаваць у палацы мясцовага графа палкоўніка ў адстаўцы Канстанціна Пшэздзецкага. А на наступны дзень кіраўнік Польшчы ўрачыста адкрыў рух першага цягніка па новаму 90-кіламетроваму ўчастку чыгункі Варапаева — Друя, які дзейнічае і сёння. Дарэчы, пабудавалі каляю за тры гады і без усялякай тэхнікі.

Субяседнік успомніў, як ля памяшкання гміны некалькі чалавек перадалі свайму прэзідэнту пісьмы, паклаўшы іх сабе на галовы. Збіраў іх нейкі чалавек з папкай, які пастаянна быў побач з кіраўніком дзяржавы. Ці то памочнік, ці то целаахоўнік. Затым польскі прэзідэнт, доктар навук, былы прафесар хімічнай тэхналогіі накіраваўся ў суседнюю Гуту, бо як спецыялісту яму было цікава наведаць мясцовы шклозавод, які таксама паспяхова дзейнічае і ў нашыя дні. Каля прадпрыемства да прыезду высокага госця зрабілі браму з каляровага шкла, якой усе тады дзівіліся.

А вось на нядаўнюю сустрэчу, ужо госця з Мінска, пенсіянер не трапіў, глядзеў яе па тэлевізары. Ды, шчыра кажучы, не надта на яе і імкнуўся, бо ў адрозненне ад некаторых дакладна ведае цану сённяшняй палітыкі Аляксандра Рыгоравіча. Да таго ж абы каго сёння так проста да беларускага лідэра не дапусцяць, гэта на кіраўніка Польшчы ішлі паглядзець усе жадаючыя. Ужо знайшлі дакладны выраз частым рабочым паездкам-палётам Рыгоравіча ў народ — паказуха.

Дакладна невядома, як у мінулым рыхтаваліся сустракаць самога прэзідэнта. Пэўна, і тады жадалі сустрэць як найлепей, але, перакананы, без таго істэрычна-нервовага напружання, якое назіраецца зараз. Аб магчымым наведванні Лукашэнкам Пастаўшчыны ведалі загадзя і не адну нараду з удзелам гаспадарнікаў і кіраўнікоў раённых службаў правялі, дзе апроч іншага абмяркоўвалі, што рабіць. Нават арганізавалі (якія малайцы!) працоўныя калектывы Пастаў правесці цэлы суботнік па добраўпарадкаванні тэрыторыі, пасля чаго ўвогуле заўсёды чысты, прыбраны гарадок яшчэ больш памаладзеў.

Але ў райцэнтр Лукашэнка так і не з'явіўся. Як і ў вёску Камаі, дзе яго таксама чакалі і дзе месціцца самая перадавая гаспадарка — калгас "Дружба". Там ужо пачалі рыхтаваць пляцоўку для прылёту прэзідэнцкага верталёта. Работнікі ДАІ і дарожнікі наводзілі парадак на мяркуемых трасах паездкі. І трэба было такому здарыцца: калі ўсё было, як гаворыцца, у поўнай баявой гатоўнасці, запланаваная сустрэча з "бацькам" перанеслася да новых указанняў. Усё той жа Павел Шарамет умяшаўся зноў у планы Лукашэнкі — тады на выратаванне апальнага журналіста ГРТ прыляцеў з Масквы міністр замежных спраў Прымакоў. Але гэта адтэрміноўка працягвала і далей казытаць нервы чыноўнікам, бо для іх сустрэча *Самога* не толькі пачэсны абавязак, але і нервовы экзамен.

І толькі крыху пазней запланаваны дэсант Лукашэнкі з нябёс адбыўся, аб ім расказалі "чэсныя" газеты і БТ. У славутых Навасёлках сапраўды было што пабачыць Рыгоравічу. Дзе яшчэ ў іншых месцах убачыш цудоўную нямецкую сельгастэхніку, сучасныя Дом культуры і паліклініку, дагледжаныя палі і ферму. За кадрам засталося толькі тое, што такія вынікі для гэтай славутай гаспадаркі яе старшыня Алег Валодзька займеў пасля таго, як дабіўся для сябе і свайго калектыву адноснай свабоды эканамічнай дзейнасці. Ім ужо так проста не пакамандуеш з раёна і вобласці, можа далёка пасланць розных там правяраючых і кантралюючых, якіх шмат развялося пры праўленні Лукашэнкі. Большасць гаспадарак у раёне самастойна і кроку ступіць не могуць, таму маюць значна больш сціплыя паказчыкі. Але не пабываў беларускі прэзідэнт там, дзе дрэнна.

Такім чынам, два прэзідэнты пабывалі ў адных і тых жа мясцінах. Але калі пра першую сустрэчу людзі гавораць з цеплынёй, то апошняя многіх пакінула проста раўнадушнымі. Ну быў і быў, нічога пасля гэтых сустрэч не мяняецца ў лепшы бок. Адзінае, што цяпер абмяркоўваюць мяцовыя жыхары і што іх непрыемна ўразіла — гэта занадта вялікая ахова прэзідэнта А.Лукашэнкі, як і празмерная пільнасць ягонай службы бяспекі. Ужо не раз гаварылася і пісалася і аб перакрыцці руху на дарогах, і аб вялікай групе шырокаплечых целаахоўнікаў, і аб забароне выглядаць у вокны. Усё гэта паўтарылася і на Пастаўшчыне. Праўда, пайшлі яшчэ чуткі, што апошні раз мясцовым міліцыянтам загадалі здаць табельную зброю, а рэкамендавалі ўзброіцца для аховы парадку гумавымі палкамі. Але гэтага я не стаў удакладняць, толькі пра сябе падумаў: чаго гэта так баіцца ўсіх і ўсяго наш усенародна абраны і паважаны?

І нарэшце апошняе. Вельмі многіх з вядомых людзей пабачылі пастаўчане нядаўнім часам. Прыгадаем тых жа Чыгіра, Гаркуна, Дамашкевіча, не гаворачы ўжо пра Пазьняка і Шушкевіча. А яшчэ раней часта наведваўся ў раён Пётр Міронавіч. З цеплынёй успамінаюць пра яго відавочцы тых сустрэч. Запомніліся людзям машэраўскія прастата і шчырасць, даступнасць і эрудыцыя, а галоўнае — не адчувалася той сённяшняй адлегласці паміж народам і ягоным лідэрам. Гэтыя якасці, а таксама еўрапейскі вытанчаны дэмакратызм і інтэлігентнасць вылучалі і польскага прэзідэнта падчас той далёкай рабочай паездкі. Кароткія ж азнаямленчыя наведванні Лукашэнкі рэгіёнаў усё больш носяць казённа-прапагандысцкі характар.

Уладзімір ШЫК.

Віцебская вобл.

Что пишут о нас

Изнанка белорусского "чуда"

Беларусь движется по пути Заира и Замбии

Светлана КАРПЕКОВА, журналист.

Вот уже второй месяц Беларусь пытается осознать результаты своего небывалого экономического подъема. После того как на заседании Совета министров были подведены итоги работы народного хозяйства страны за первое полугодие, официальные экономисты и политики неустанно заявляют о начале стабилизации, а их оппоненты доказывают, что белорусское экономическое чудо — колосс на глиняных ногах.

Самая главная цифра, которой гордится сегодня страна, — 11 процентов прироста ВВП. Однако внутренний валовой продукт для обычного человека — термин не слишком понятный и в достаточной степени абстрактный. Рядовые граждане определяют тенденции развития через собственные микроэкономические показатели — зарплату, наполненность магазинов, степень социальной защищенности. Для них у белорусского правительства тоже нашлись "чудесные" цифры. В недавнем совместном заявлении Совета министров и Национального банка Беларуси эти два столпа государственной власти уверяли население, что за семь месяцев текущего года его реальные денежные доходы по сравнению с аналогичным периодом 1996 года выросли на те же 11 процентов. Сегодня большинство жителей республики — миллионеры, поскольку, по официальной статистике, средняя зарплата рабочих и служащих составляет порядка двух миллионов белорусских рублей (примерно 400 тысяч российских).

Однако наслаждаться плодами экономического расцвета и "миллионерского" статуса не приходится: астрономические нули на дензнаках свидетельствуют лишь о непрекращающихся инфляционных процессах, а не о реальном повышении уровня доходов. На самом деле происходит снижение номинальной заработной платы. Если на 1 января 1997 года она составляла около 103 долларов, то сейчас снизилась до 75.

Между тем в августе минимальный потребительский бюджет в Беларуси составлял чуть более 1 миллиона 860 тысяч белорусских рублей — такой должна быть "потребительская корзинка" каждого члена среднестатистической семьи из четырех человек. То есть сегодня эта самая семья потребляет ровно тот минимум продуктов, имеет тот минимум вещей, которые необходимы для существования, и ни на йоту больше. Более трети жителей Беларуси и вовсе находятся за чертой бедности. Они выживают лишь за счет того, что осенняя урожайная пора позволяет накопить какие-то запасы (чаще всего не денежные, а товарные). Все это неудивительно, если учесть, что примерно 60 процентов предприятий страны являются стабильно убыточными.

Независимые эксперты отмечают, что реальная средняя заработная плата дотягивает лишь до половины "потребительской корзины". Это означает, что население вынуждено каким-то образом подрабатывать. Вот тут и вступает в игру бдительное государство. По итогам общереспубликанской перерегистрации, число хозяйствующих субъектов сократилось почти вдвое. Сейчас из-за ужесточения правил торговли умирает "челночный" бизнес, в котором ранее было занято около миллиона человек.

Руководитель Центра исследований будущего профессор Александр Потупа считает, что так называемый экономический подъем Беларуси выглядит чудом хотя бы потому, что в стране практически нет инвестиций, а кредитные линии резко ослаблены. "У нас самый низкий уровень инвестиций на душу населения — порядка нескольких долларов, — говорит А.Потупа. — Внутренние потоки инвестиций перекрыты: белорусские предприниматели уже давно вывозят капитал за пределы страны. Тем временем дефицит внешнеторгового баланса нарастает со скоростью порядка 100 миллионов долларов в месяц и на сегодняшний день превысил один миллиард долларов. В стране практически сломан валютный рынок. Легально приобрести доллары сегодня не могут ни предприятия, ни граждане".

Кстати, стоимость доллара в Москве в пересчете на белорусские рубли на 25—30 процентов выше, чем в Минске. Естественно, что на местном рынке валюту продавать никто не хочет, и она вывозится за пределы страны. В последнем отчете Всемирного банка об экономической ситуации в Беларуси отмечается, что ее валютные резервы упали до такого низкого уровня, что легко может развиться кризис импорта. В документе также говорится, что избранная правительством стратегия явно несостоятельна и абсолютно несовместима с задачей ликвидации бедности и повышения жизненного уровня. Всемирный банк констатирует, что экономическая ситуация в Беларуси аналогична той, что наблюдалась в Заире и Замбии с 1980 по 1987 год.

Инфляция в стране превзошла примерно в два раза планируемый на год уровень уже к середине года. По официальным данным, за истекшие восемь месяцев она составила около 45 процентов. Эту безрадостную картину усугубляет тот факт, что правительство добывает средства для существования древнейшим способом — периодически печатая деньги. Что и позволяет президенту Беларуси Александру Лукашенко говорить: в его стране в отличие от России зарплату выплачивают вовремя. Действительно, в большинстве случаев задержки если и имеют место, то не более чем на месяц-два.

Что касается роста ВВП, то он имеет очень простое объяснение. Первый вице-премьер российского правительства Борис Немцов в интервью "Белорусской деловой газете" заявил: "Мы исследовали эту тему. Это рост производства никому не нужных товаров. Он только в штопор вводит экономику, потому что омертвляются оборотные средства, идет работа на склад, и в результате все это деградирует". С Немцовым трудно не согласиться. Тем более и белорусское Министерство статистики и анализа свидетельствует, что на складах предприятий периодически скапливается до 50 процентов готовой продукции.

И если верна поговорка "цыплят по осени считают", то в Беларуси в нынешнюю осень у каждого свой счет: упитанные птички гуляют по страницам официальных отчетов и сводок, а худосочные экземпляры остаются для ежедневного употребления. Очередной иллюстрацией белорусского экономического "чуда" станет намеченное на октябрь повышение цен на хлеб и тарифов на коммунальные услуги.

Минск.

("Известия")

Стоп-кадр

Сбор молодых офицеров частей и подразделений Внутренних войск Республики Беларусь — выпускников военных учебных заведений последних лет — прошел в Минске.

Молодые офицеры отрабатывали методику организации занятий с личным составом по строевой подготовке, по изучению средств связи, автоматизации, изучали материальную часть новой техники и вооружения, средств индивидуальной защиты.

На снимке: *методические занятия по строевой подготовке.*

Фото Аркадия НИКОЛАЕВА, БелТА.

В Дортмунде белорусским кинематографистам отказали в финансовой поддержке. Грубо, но женственно...

На первой европейской конференции фестивалей женского кино, недавно состоявшейся в Дортмунде, Беларусь представляла киностудия "Татьяна".

— Международный фестиваль женского кино, который мы успешно проводим на Беларуси уже четвертый год подряд, — один из крупнейших фестивалей женского кино в Европе. И единственный в своем роде на территории всего постсоветского пространства, — **рассказывают Элла МИЛОВА и Ирина ПИСЬМЕННАЯ, арт-директор и директор киностудии "Татьяна".** — Наверное, поэтому в Дортмунде нам уделялось достаточно много внимания. Но, несмотря на то, что наша профессиональная планка была достаточно высока, Беларусь, к сожалению, на конференции находилась на птичьих правах.

Международные фестивали женского кино — масштабные события для культурной жизни не только нашей страны. Посему на европейской конференции был создан специальный комитет по распределению помощи на проведение подобных фестивалей. Выяснилось, что из девяти стран, представители которых приехали на конференцию, Беларусь — единственная, кто **не имеет права на финансовую поддержку.** К слову, весьма значительную. Потому как в парламентских структурах ОБСЕ членство Беларуси было приостановлено. Но это, подчеркнем, была конференция фестивалей женского кино. Ни для кого не секрет, что прекрасная половина человечества отличается необыкновенной чувственностью натуры и мягкостью души. В общем, нам решили помочь. Нелегально, разумеется. Мол, официально мы будем давать грант на какой-нибудь другой фестиваль, а деньги все равно получит ваша киностудия. Будучи людьми порядочными и не идущими на беспринципный компромисс, мы... отказались. И предложили организаторам конференции фестивалей женского кино открыто помочь нам. При этом, естественно, учитывая нашу специфическую политическую ситуацию. Наши зарубежные друзья, вдохновившись идеей, в ответ предложили следующую конференцию фестивалей провести в Минске...

Интересно, что практически одновременно с программой женских фильмов киностудии "Татьяна" в Дворце киноискусства "Бабилон" демонстрировался фильм Юрия Хащеватского "Обыкновенный президент". И значительная часть лавров, предназначенных Хащеватскому, абсолютно незаслуженно досталась нам. Вообще, по словам немецких зрителей, в Германии этот фильм идет во многих кинотеатрах и его видел практически каждый интеллигентный человек. Наверное, под влиянием увиденного на многочисленных встречах со зрителями к нам неоднократно подходили желающие помочь. С необычайным сочувствием, даже состраданием и соболезнованиями интересовались, как нам живется в Беларуси. Предлагали даже остаться...

...Белорусские кинематографисты возвратились на родину. В полном составе. И сейчас заняты организацией предстоящих встреч с зарубежными кинематографистами на белорусской земле...

Прозаично. Но патриотично...

Марина КОКТЫШ.

Украінскія парламентарыі зацікаўлены ў кантактах з беларускімі калегамі

Пытанням развіцця гандлёва-эканамічных сувязей паміж нашай рэспублікай і прадпрыемствамі Данбаса была прысвечана сустрэча беларускіх дыпламатаў з дэпутатамі з гэтага ўкраінскага рэгіёна. Яна адбылася 10 кастрычніка ў пасольстве нашай рэспублікі ва Украіне.

Як паведамілі БелТА ў беларускім дыпламатычным прадстаўніцтве ў Кіеве, у ходзе сустрэчы разглядалася таксама магчымасць адкрыцця прадстаўніцтва беларускіх прадпрыемстваў у Данецку і арганізацыі ў шахцёрскай сталіцы пастаянна дзеючай выстаўкі вырабаў лёгкай прамысловасці Беларусі.

У ходзе гутаркі бакі выказваліся за ўстанаўленне пастаяннага абмену інфармацыяй паміж абласнымі рэдакцыямі газет і тэлерадыёстанцый па праблемах рэгіянальнага супрацоўніцтва. Акрамя таго, дэпутаты Данецкай вобласці звярнуліся да дыпламатаў з просьбай дапамагчы арганізаваць наведванне беларускага парламента.

Гэта не адзінкавы прыклад зацікаўленасці ўкраінскіх парламентарыяў ва ўстанаўленні ўзаемавыгадных канкактаў са сваімі беларускімі калегамі. Як стала вядома БелТА, у пачатку лістапада народныя дэпутаты суседняй дзяржавы наведаюць мінскія абласны і гарадскі Саветы дэпутатаў, а 14 кастрычніка дэлегацыя Вярхоўнай Рады Украіны сустрэнецца ў Мінску з калегамі з Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Ігар РУБАН, БелТА.

У гонар бітвы каля пасёлка Леніна

У мінулую нядзелю зноў, як 54 гады таму, падняліся на былую франтавую вышыню 215,5 ветэраны Войска Польскага, удзельнікі бітвы каля пасёлка Леніна і ветэраны Савецкай Арміі. Тут, на беларускай зямлі, першая польская пяхотная дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі, сфарміраваная на тэрыторыі СССР з польскіх патрыётаў і ўзброеная савецкай тэхнікай, 12 кастрычніка 1943 года ўступіла ў свой першы бой з фашысцкімі захопнікамі.

На месцы бітвы ў пасёлку Леніна цяпер знаходзіцца мемарыяльны комплекс, а на франтавой вышыні 215,5 — музей савецка-польскай баявой садружнасці. У гонар гэтай бітвы, у памяць аб загінуўшых воінах 12 кастрычніка адбыўся вялікі мітынг, дзе выступіла Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Польшчы ў Беларусі Эва Спыхальска, а таксама ветэраны мінулай вайны. На магілы савецкіх і польскіх воінаў былі ўскладзены вянкі ад пасольства Польшчы, ад Магілёўскага аблвыканкама, Горацкага райвыканкама, ад мясцовых працоўных калектываў і навучальных устаноў.

Мікалай НАЗАРОВІЧ, БелТА.

Горкі.

Крымінал

Затрымалі фальшываманетчыкаў

З прымяненнем стральбы па колах аўтамабіляў былі затрыманы на вуліцы Маскоўскай у Брэсце дзве машыны замежнай вытворчасці з прыбалтыйскімі нумарамі. Марнымі былі спробы тых, хто сядзеў за рулём гэтых аўтамабіляў, пазбегнуць сустрэчы з супрацоўнікамі Брэсцкага камітэта па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй. А знаёміцца з работнікамі органаў правапарадку ў двух грамадзян Прыбалтыкі і аднаго брастаўчаніна не было ніякай рацыі. Пасля арышту ў іх канфіскавалі дзве з палавінай тысячы фальшывых нямецкіх марак. Цяпер па гэтай справе вядзецца следства.

Іван КУКСА, БелТА.

Брэст.

Віктар АСТАПЕНКА

Зладзюга

Апавяданне

— Вунь тот! Чаво он шукает так рана? Грыбы? — запытала прывабная, пульхная дзяўчына, млява коўзаючы языком па пунцовых вуснах у пошуках рэштак піражнага.

Уся кампанія — два хлопцы, заляпаныя кішэнямі і кішэнькамі са стракатымі лэйбамі, цурубалкамі, маланкамі, і яшчэ адна дзяўчына ў блішчастым убранні і з цёмнымі акулярамі, за шкельцамі якіх хаваліся не толькі вочы, але часткова лоб і шчокі, — усе павярнулі твары да ўскрайку лесу. Там, не спяшаючыся, тупаў чалавек з кійком. Часам ён прыцішваў крокі і прыглядаўся. У адным месцы чалавек адвярнуў кійком быльнёг і галлё і стаў асцярожна спускацца ў раўчук.

— Смотрите! Что-то нашел! — выгукнула блішчастая дзяўчына ў акулярах. — Ого! Бутылку! Джордж, зачем она ему? Коллекцию собирает, что ли?..

Той, каго назвалі Джорджам, прыжмурыўся, разглядаючы постаць мужчыны з кійком:

— Так это ведь наш Семен Степанович, Сёма! Пустые бутылки собирает! Вот что!

— Хто такі Сямен Стяпанавіч? Аткуль ты яво знаеш? — зацікавілася пульхная дзяўчына.

— Об этом лучше Майкл расскажет. Ему больше, чем мне, от Сёмы доставалось. Давай, гони, Майкл! Осветляй ситуацию!

— А что про него?.. Учитель географии. Не нарезался, но мне больше тройки не ставил. Любили его, потому что летом в походы водил. Рассказывал много всякого. Самому Сёме не повезло. Сын его, единственный, из Афгана не вернулся. Женка, тоже учительница, умерла. Один теперь. На пенсии. Не работает. И ничего на старость неназапасил. Недавно видел его на базаре. Продавал книги. У него их дома — о-го-го! — сколько!..

Тым часам былы выкладчык геаграфіі наблізіўся да "Вольвы", прымятая трава вакол якой была засмечана бліскучымі каляровымі паперкамі, шалупіннем заморскіх фруктаў, слоікамі і бляшаначкамі разнастайных памераў і форм. Па колькасці апарожненых пляшак, па бугру вуголля на касцярышчы і па змучаных тварах маладых людзей няцяжка было здагадацца, што гульбішча тут доўжылася з вечара і праз усю ноч.

— Как ты, говоришь, его?.. Семен? — запыталі з-пад цёмных акуляраў дзявочыя вусны. — Семен?.. Ну?

— Степанович!

— Семен Степанович! А, Семен Степанович! — дзяўчына памахала настаўніку рукой.

Той спыніўся, агледзеў маладых людзей:

— Ага, пазнаю, Грыша, Міша — сябры школьныя. Даўно, здаецца, не сустракаўся з вамі. Бачу, справы ў вас ідуць няблага!

— Не жалуемся! — адказаў Джордж, якога настаўнік назваў паранейшаму — Грыша, і дадаў: — Приспособились! А как вы?

— Хварэю... Крыху ачуняў. Рухаюся вось...

— Майкл! Я даже не знала, что ты не Майкл, а обыкновенный Миша! — здзівіліся цёмныя акуляры. — Семен Степанович! Наш Майкл, то есть ваш Миша, рассказал про вас, про то, что у вас книг очень много. А еще вы, оказывается, и бутылки коллекционируете: я только что видела. Наклейками интересуетесь? Да? Я это понимаю. Хобби ваше? Да? А вот Майкл, например, собирает молнии от джинсов и прочего... Правда, Майкл? Сколько их уже у тебя, этих молний?.. Майкл, подай-ка мне вон ту бутылку!.. У вас, Семен Степанович, с такой наклейкой есть бутылка? Нет?!

Не чакаючы адказу настаўніка, ашаломленага стракатнёй, дзяўчына ўзяла пусты стакан і выліла з яго тое, што яшчэ заставалася ў бутэльцы. Бутэльку кінула настаўніку:

— Возьмите! Пусть эта бутылка с такой красивой наклейкой пополнит вашу коллекцию! Напоминает о встрече с бывшими учениками! Берите! Берите!

Сямён Сцяпанавіч разгубіўся: нязграбна кінутая дзяўчынай бутэлька крыху не далецела да яго ног. Ён у нерашучасці разглядаў яе, па яго твары было бачна, што вырашаў — сагінацца, каб узяць бутэльку, ці хай сабе яна валяецца. Нарэшце надаў свайму твару выраз зацікаўленасці:

— Сапраўды, у мяне няма такой. Цудоўная наклейка!

Майкл сказаў:

— Я недавно видел вас на базаре. Вы меня, кажется, не заметили: продавали книги. Какой навар получился?

— Нічога не купілі. Сёння няма прагі да кніг. У пашане зусім другія каштоўнасці: долары, анучы з-за мяжы, шыкоўныя машыны... — Сямён Сцяпанавіч глянуў на "Вольву" і запнуўся.

Джордж-Грыша і Майкл-Міша паспелі перахапіць яго позірк і ўсміхнуліся.

— Похоже, что вы правы. А если ковырнуть глубже: какой толк в тех книгах, что нас заставляли читать в школе? — запытаў Джордж і прадоўжыў: — И книги, и многие школьные предметы оказались совершенно ненужными. Хотите — обижайтесь, хотите — нет, но и ваша география ничего нам не дала. Я вот побывал во многих странах. В Турции, например. В Греции. Много раз — в Польше. И на все это не понадобилась география. И с другими предметами так. С белмовой, например. Куда с ней сунешься?

— Вот чего в школе не хватало, — уступіў у размову Майкл, — английского. Знать хорошо английский — большой бизнес! Немецкий — тоже! А нас в школе не научили ни спикать, ни шпрехать. Теперь от этого — большие потери!..

— Аднак мне пара, пайду, — сказаў Сямён Сцяпанавіч і апусціў бутэльку з прыгожай наклейкай у сумку. — Дзякуй вам!

Ляніва рухаючы прыпухлымі павекамі, пульхная дзяўчына параіла настаўніку:

— Кали што, то ету бутылку и в магазин сдать можна, ана наша, савецкая, только наклейка чужыми буквами. Цяпер усё чужое — мода!

Сямён Сцяпанавіч, цяжка ступаючы і дапамагаючы сабе кійком, пакрочыў ад светла-блакітнай "Вольвы".

Майкл глынуў жаўтаватага напою, паморшчыўся і сказаў наўздагон настаўніку:

— До чего докатился! Пустые бутылки собирает!..

— А помнишь, — перапыніў Джордж, — как Сема тебе однажды новую курточку купил?!

— Было. Купил. Ездили всем классом в Брест. Черт, где я тогда посеял свою курточку? То ли в лесу, то есть — в пуще... как ее? В Беловежской!.. Или в Кобрине, куда мы заезжали в музей Суворова? Только в Минске заметил пропажу. Сказал Семе. Он очень расстроился. И... подумать только! — купил мне новую!

— И ты взял, конечно? — запытала дзяўчына ў акулярах.

— А как домой возвращаться? И так плохо, и так плохо. Матерь сразу с вопросами. А я ей: как дело случилось. А она: пойду, говорит, отдам учителю деньги. — Не знаешь — сколько заплатил? Отвечаю: двадцать вроде бы. Только все равно деньги он не возьмет... — Не иди! Не пошла...

— Рассказал бы ты об этом раньше, я бы не выливала остатки из бутылки. Угостила бы учителя.

— Пустое: Сёма — непьющий!

— А все-таки, если по совести, то ты остался должником, — не сунімалася дзяўчына. — Теперь, когда ты весь в модных тряпках и деньги считаешь пачками, мог бы и вернуть долг за курточку. Мог бы? Да?

— А чего?! Теперь мог бы! — пацвердзіў задаволена Майкл, потым прыўзняў брыво і ўсміхнуўся: — А я вроде бы вернул долг! Сколько стоила курточка? Рублей двадцать. Сколько Сема получит за пустую бутылку? Две тысячи. Во сколько раз больше перепало Семе? Задача! Ну?

— В сто раз! — імгненна падлічыў Джордж.

— Вот! Получается, что долг за учителем! — Майкл зарагатаў. — Да, ладно! Не будем мелочиться! Как говорят: где наше не пропадало! — Майкл пагладзіў пульхную, пацягнуў да сябе: — Забудем про это! Продолжим, с чего начали! Жоржик, достань-ка из тачки новую бутылочку!..

Сямён Сцяпанавіч аказаўся першым з наведвальнікаў перад адкрыццём невялікай крамы, дзе ён звычайна набываў усё яму патрэбнае і дзе прадаўшчыца Мар'я Антонаўна, пенсіянерка, заўсёды спачувальна ставілася да яго. Але не яна сёння, а новенькая стаяла за прылаўкам. Шырока афарбаванае сінім колерам наваколле вачэй новенькай надавала ім падабенства да двух чайных сподачкаў, па вытаркнутых наперад шчоках сцёбалі пры кожным руху галавы блішчастыя завушніцы, зіхацеў на шыі ланцуг з крыжыкам, патануўшы сярод шыкоўных грудзей, што рваліся на прастору з-пад ззяючай малінавымі агеньчыкамі сукенкі. Сямён Сцяпанавіч з цяжкасцю пазнаў у новай магазіншчыцы былую вучаніцу Галю Шлындзікаву, маўклівую ля дошкі і занадта гаваркую пры абароне сваіх правоў і гонару. Настаўнікі цярпліва выводзілі Галіне тройкі і марылі аб тых часах, калі яна, нарэшце, пакіне школу. Вядома ж, і Галіна ахарактарызоўвала ўсіх, хто яе вучыў, бязлітаснымі катамі, якія здзекваюцца з чэсных і праўдзівых вучняў і патакаюць падлізам і любімчыкам, і таксама марыла аб тых часах, калі пакіне школу. Пытанне — хто і як дапамог Галіне ўладкавацца на такое прыбытковае месца, як пасада магазіншчыцы, не занадта зацікавіла Сямёна Сцяпанавіча, ён яшчэ ў школе ведаў, што людзі накшталт Галіны ў жыцці на прападаюць, сваё заўсёды вырвуць ды і чужога яшчэ прыхвацяць.

— Добры дзень усім! — стараючыся надаць свайму голасу бадзёрасць, гучна сказаў Сямён Сцяпанавіч. — А дзе Марыя Антонаўна? Ці яна канчаткова зволілася, ці толькі часова адсутнічае?

Пытанні засталіся без адказу.

— Мне бохан хлеба. Вось тут тры пустыя бутэлькі. Якраз хопіць, — рукі Сямёна Сцяпанавіча крыху ўздрыгвалі, калі ён выстаўляў бутэлькі на прылавак, бо адчуваў, што ад непрадказальнай у сваіх паводзінах Галіны можна чакаць што заўгодна, асабліва зараз, калі яна стала ў нейкім сэнсе гаспадыняй становішча. Уся спадзяванка была на ранні час, на тое, што яна не паспела раскачагарыць свае нервы і красамоўства.

Галіна разглядвала настаўніка, у яе вачах загараліся гарэзлівыя смяшынкі:

— Па-перш, гаварыце нармальна, як люди! Па-руски! Тут вам не школа, и нечева каверкацца!

Галіна правяла поглядам па кліентах. Іх было пакуль няшмат: дзве жанчыны пенсійнага ўзросту ды зухаваты хлапец у стракатым адзенні і з цыгаркай пад рыжымі вусамі. У Галіны не было сумневу, што гэтыя людзі стануць на яе бок, падтрымаюць, і таму ва ўпор нацэлілася на жанчын. Тыя зразумелі, што неабходна іх выказванне наконт заявы прадаўшчыцы, завarушыліся, адна аказалася смялейшай і падала голас:

— А няўжо ж! Што праўда, то праўда. Іншы раз так скажуць — нічога не зразумееш.

Другая дадала:

— Не, гэты чалавек яшчэ нічога, зразумела гаворыць. А то бывае праз радыё так затараторацъ, быццам і па-нашаму, а нічагусенькі да розуму не даходзіць.

Зухаваты хлапец паганяў языком туды-сюды цыгарэту, дзьмухнуў, і яна, перакуліўшыся некалькі разоў у палёце, саўганулася пад прылавак:

— Ша, бабульки! Дайте время! Придет пора, когда от белорусского и два-три слова не останется. Все заговорят по-человечески. Заставят и тех, что будут упираться!

— Вот бачыте! — павучальна і спачувальна звярнулася Галіна да настаўніка. — Увесь народ меня поддерживает! Так что забывайте ету мову! Не будет ей ходу! А бутылачки свае — назад! Гавару — тары нет! Магу — тока взамен! Скока пустых — бярыце стока водки. Можна — вина! Чего смотрите? Усё сказала! И не задерживайте покупателей! Вон ужо скока за вами стаит!

— Мне толькі адзін бохан хлеба...

— Не за-дер-жи-вай-те! Сказала — и аканчацельна! Бутылка — за бутылку!

— Навошта мне гарэлка! Я ж не п'ю. Дый няма ў мяне столькі тысяч, каб купляць спіртныя напоі.

— Не прыбядняйцеся! — едка ўсміхнулася Галіна. — Пенсію, нябось, палучаеце. Знаю, што небальшую: учыцелям памногу не даюць. Кака работа в них была — така й пенсія палучылась. Не гружчыки, ни адин ни надарвався на рабоце.

Настаўнік з дрыготкай у голасе сказаў:

— Пенсію?.. Атрымаў — і няма яе! На лекі пайшла. Амаль уся! Толькі палову з таго, што прыпісалі дактары, здолеў выкупіць у аптэцы... Толькі палову...

— Ета меня не касаецца. Вобче, учицеля усе прывыкли хварець. Другия люди не делаюць так... А тары пустэй на вашы бутылки у миня нет!..

— Не разумею, чаму ў Марыі Антонаўны заўсёды было куды паставіць пустыя бутэлькі?..

Лепш бы настаўніку не гаварыць гэтых слоў! Надзьмутыя Галіны шчокі імгненна сталі пунцовымі, а вочы, здавалася, гатовіліся выскачыць з акружаючай іх фарбы.

— Сказала — атрэзала: нет! Што яшчэ хочыце? Забирайце! Павыставили тут! Не задержывайце! Иза вас многия апаздаюць на работу! Пакупацели! Пасматрице тока, што етат чалавек вытвараець! Яму сто раз абъяснили, а он задержываець. Ну!..

Галіна локцем штурхала бутэлькі да краю прылаўка, яны цёрліся адна аб другую, ціхенька дзынкалі... Настаўнік падставіў сваю сумку...

— Во так! Няма денех — не мішайце пакупацелям!..

Настаўнік, нерашуча ступаючы, направіўся да дзвярэй, спыніўся, задумаўся і раптам крута павярнуў назад. Пакупнікам падалося, што перад імі з'явіўся зусім другі чалавек. У некалькі крокаў ён адолеў адлегласць да прылаўка, на які таропка паставіў тры бутэлькі, падышоў да паліцы, зняў з яе бохан хлеба і, не гаворачы ні слова, пакінуў краму.

Галіна толькі пасля яго знікнення ўцяміла, што здарылася. Замітусілася. Заенчыла:

— Сматрице, што дееццa! На глазах, при свидецелях деньги не заплацив! Зладюга! Учицелем быв! Чаму дятей учив?! Дяржите яго! Милицыю сюда!

Кінулася да дзвярэй. З прылаўка бразнулася на падлогу гіра і пакацілася ўслед. За дзвярыма верашчаў голас:

— Стой! Милицыю сюда! Люди, сматрице! Зладюга! Хлеб украв!..

Аднак Галіна не рызыкнула бегчы наўздагон па вуліцы: краму не пакінеш. Вярнулася з растрапанай прычоскай, падабрала з падлогі гіру, злосна дзеўбанула ёй аб прылавак:

— Не! Не прашчу! Буду усим расказваць, каки он злaдюга. Пускай асцерагаюцца! Сёння — хлеб, завтра у фортачку за вяшчами палезиць! А то на улицы каво аграбиць! Не-е-е! Не дам!..

Хтосьці з жанчын падаў голас:

— Не было ў яго другога выйсця! Без хлеба, без ежы застаўся. Адзін і хворы. І без грошай. Як жыць?..

У чарзе загулі. Цяжка было разабраць, хто і пра што гаворыць. Толькі відавочна — большасць спачувала настаўніку. Галіна разгублена круціла галавой: у каго шукаць падтрымку? Наперад выступіў высокі дзяцюк у зашмальцаванай вопратцы:

— Вось што, таўстуха! Давай — закругляй мітынг! Тара ў цябе — не брашы! — ёсць заўсёды і будзе! Разумна зрабіў настаўнік, бяда толькі ў тым, што ціхі ён занадта, інтэлігентны! Не здольны сказаць табе таго, што ты заслугоўваеш! Я за яго скажу!.. Ды ты пачакай! Пачакай! Не надзімайся так, размалёваная жаба, — лопнеш! Паставілі цябе сюды — шавяліся, працуй! А не... дык!..

Галіна разінула рот, з шыпеннем уцягнула ў сябе паветра, прыўзнялася, пальцы рук з чырвонымі пазногцямі растапырыліся, але перш чым кінуцца ў перапалку, правяла позіркам па тварах пакупнікоў, сустрэла насупленыя, злыя пагляды і адразу ж абмякла. Моўчкі пасунулася за вагі і ўжо адтуль запытала сцішаным голасам, не падымаючы вачэй:

— Вам што? Чаго хочаце?..

Параўнаем?

...А хіба ж мяса больш стане?

Меры, якія заклікaны палепшыць справу, рэзка яе пагоршаць

Даволі цікавы дакумент трапіў мне ў рукі. Ён называецца "О серьезных недостатках в организации торговли на рынках" і народжаны ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Беларусі. Цяпер "спушчаны на месцы" для выканання.

У ім нямала слушнага наконт ліквідацыі выяўленых недахопаў. Але вось галоўны вывад проста дзіўны. Сутнасць у тым, што на рынках паменшала мяса. Прычына гэтага бачыцца ў тым, што яго рэалізацыяй займаюцца перакупшчыкі. "На многих проверенных рынках сформировались группы людей, для которых перепродажа мяса стала основным занятием", — чытаю ў дакуменце і разважаю: а што тут кепскага? Усе нашыя магазіны — таксама пасрэднікі паміж вытворцамі і пакупнікамі, а для іх прадаўцоў гэта "стало основным занятием". Чытаю далей: "Осуществление торговли мясом одними и теми же лицами зафиксировано на Полоцком рынке". Ну і што? Хіба ў дзяржаўным магазіне прадаўцы мяса мяняюцца штодзённа?

Вось такі ўзровень мыслення! Але не аб ім размова. А аб мерах. А яны такія: "Министерству сельского хозяйства и продовольствия предусмотреть меры, ограничивающие продажу колхозами и совхозами крупного рогатого скота и свиней физическим лицам за наличный расчет".

Талковаму спецыялісту зразумела, што ажыццяўленне гэтага прывядзе толькі да пагаршэння сітуацыі. Бо калгасы самі не хочуць, ды і не ўмеюць гандляваць мясам на рынках. У іх няма ні спецыялістаў, ні ахвотнікаў займацца такой справай. Продажам іх мяса займаюцца так званыя "фізічныя асобы". Цяпер жа, калі ім забароняць гэтым займацца, мяса на рынках паменшае яшчэ. Больш таго, менавіта гэтыя перакупшчыкі даюць гаспадаркам жывыя грошы, якія дазваляюць хоць зрэдку выплачваць зарплату працаўнікам палёў.

І, нарэшце, калі кіравацца такой логікай і "адсякаць пасрэднікаў" на рынку, дык варта пазачыняць і ўсе магазіны — прадуктовыя і прамысловых тавараў. Няхай самі заводы і калгасы прадаюць свае тавары.

Такім чынам, меры, якія заклікаюць палепшыць справу, рэзка яе пагоршаць. Што ні кажыце, а прыдумаць такі дакумент трэба ўмець.

Алесь ДРАБЧУК.

СНГ

По итогам заседания Совета глав правительств Содружества в Бишкеке подписано 24 документа

В столице Киргизии — Бишкеке прошло очередное заседание Совета глав правительств стран Содружества.

Перед участниками встречи выступил президент Киргизии Аскар Акаев, который напомнил, что пять лет назад в Бишкеке собрались главы государств и правительств Содружества для того, "чтобы осмыслить реалии и наметить практические шаги движения вперед". Тогда, в 1992 году, "нас упрекали в том, что мы не смогли преодолеть синдром медлительности и нерешительности в решении срочных проблем, что Содружество продолжает расползаться", отметил А.Акаев. Оценивая сегодня пройденный за пять с лишним лет путь, киргизский лидер с удовлетворением отметил отсутствие расхождений во мнениях о том, что Содружество все-таки состоялось.

"Я считаю, что Содружество в его нынешнем виде пока не отвечает потребностям государств-участников. Необходимо выработать новые концептуальные подходы к его реформированию", — убежден А.Акаев. По его мнению, СНГ должно иметь прежде всего направленность экономического объединения, "в противном случае оно может не состояться".

Премьер РФ Виктор Черномырдин, выступая на заседании, назвал основной задачей руководящих органов государств СНГ повышение эффективности и увеличение отдачи взаимных хозяйственных связей стран Содружества.

Как заметил глава правительства, "сегодня в СНГ уже нет дискуссий, нужна ли интеграция". По его словам, теперь речь идет о формах и степени прогресса интеграции, о реализации принимаемых решений по вопросам развития взаимовыгодных экономических отношений. Начало этому процессу, напомнил он, было положено весной текущего года принятием концепции экономического интеграционного сотрудничества стран СНГ.

По его данным, объем внешнеторговых операций за первое полугодие 1997 года снизился на 10% по сравнению с прошлогодним уровнем. В.Черномырдин убежден, что "это положение необходимо менять в корне".

Вместе с тем он отметил, за девять месяцев текущего года объем промышленного производства в среднем по Содружеству превысил аналогичный прошлогодний уровень на 1,4%. Наибольший успех был достигнут Киргизией, Беларусью, Грузией, Узбекистаном и Казахстаном.

Как сообщил на итоговой пресс-конференции Исполнительный секретарь СНГ Иван Коротченя, главным в ходе прошедшей встречи стал вопрос о механизме реализации концепции экономического интеграционного развития стран Содружества. Данный механизм устанавливает порядок разработки, согласований и осуществления совместных интеграционных мероприятий.

Кроме того, главы правительств рассмотрели проблемы, связанные с созданием транснациональных корпораций, соглашение о регулировании социально-трудовых отношений в этих корпорациях, а также соглашение об общем аграрном рынке стран СНГ.

В.Черномырдин отметил, что в рамках СНГ в настоящее время "идет будничная работа, та работа, которая должна проводиться в рамках Содружества". Он отметил, что в Содружестве "никакого нажима нет, есть полная демократия". В то же время он подчеркнул, что на переговорах по проблемам развития СНГ существуют определенные разногласия, однако они решаются в рабочем порядке.

В.Черномырдин считает, что "те, кто хоронят сегодня СНГ, глубоко ошибаются".

Беназир Бхутто поощряла... наркобизнес. И не только в Пакистане

У правительства Пакистана есть основания полагать, что часть денег на замороженных счетах бывшего премьер-министра Беназир Бхутто и ее супруга Азефа Али Зардари получена от наркодельцов, пишет "Таймс". Возглавляющий расследование сенатор Зафир Рахман заявил, что правительство располагает документальными доказательствами того, что миллионы фунтов стерлингов на зарубежных счетах Бхутто были нажиты незаконным путем. Последние обвинения в связях семьи Бхутто с наркобизнесом вывели крупнейший в истории страны финансовый скандал на новый виток. Пакистанские власти заявляют, что семья Бхутто владеет недвижимостью и имеет солидные банковские счета в девяти странах мира, в том числе Великобритании, Швейцарии, Франции и США. Запрос о возможности заморозить открытые там счета уже направлен в Лондон и Вашингтон. Будучи министром инвестиций, Азеф Али Зардари предоставлял "нужным людям" лицензии и государственные подряды и получал от них фиксированные комиссионные, за что и получил прозвище "господин Десять Процентов". Кроме того, супругов обвиняют в уклонении от уплаты налогов. Если они предстанут перед судом и будут признаны виновными, им грозит тюремное заключение, а лично Беназир Бхутто, лидеру оппозиционной Народной Партии Пакистана — семилетний запрет на политическую деятельность.

Изобрели блокиратор нетрезвости

Власти американского штата Висконсин планируют ввести новое, по их словам, более гуманное наказание для пьяных водителей, пишет "Чикаго Трибьюн". Предполагается, что попавшиеся с поличным нетрезвые водители будут обязаны за свой счет установить в автомобиле некое устройство, подобие контрольной дыхательной трубки у дорожной полиции. Чтобы включить зажигание, сначала нужно будет подышать в трубку. Если содержание алкоголя в крови превышает 4 сотых процента, зажигание автоматически блокируется. Наличие устройства будет обязательным и безусловным и для нарушителей со стажем, и для тех, кто впервые преступил закон, за исключением малообеспеченных граждан. Муниципальный суд города Мэдисон, столицы штата, надеется, что эта мера сохранит немало жизней и будет более эффективной, чем лишение водительских прав или конфискация автомобиля.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Эстония

Леннарт Мери выступает за развитие сотрудничества с Россией

Президент Леннарт Мери считает, что развитие отношений с Россией должно стать приоритетным направлением его страны.

Выступая с речью в Хельсинки на семинаре по вопросам европейской интеграции, он заявил, что "развитие отношений с Россией является одним из приоритетов Европейского Союза. Это, само собой разумеется, касается и Эстонии".

По словам Л.Мери, "Эстония не прячется со своим комплексом прошлого за спину ЕС, а без колебаний протягивает руку России, так как за спиной Эстонии стоит ЕС".

Президент отметил, что Эстония позитивно расценивает предложение премьер-министра России Виктора Черномырдина о создании межправительственной комиссии. "Ее первой задачей должно стать определение основных принципов сотрудничества, которое должно основываться на взаимной пользе, международном праве и долгосрочных перспективах", — сказал Л.Мери.

По его мнению, добиться этой цели будет нелегко, так как пережитки прошлого встречаются как в Эстонии, так и России. "Но я уверен, что мы сможем отфильтровать мутную взвесь политической риторики в прозрачную родниковую воду", — подчеркнул президент.

Он также заявил, Эстония в будущем намерена "быть примером в обеспечении прав человека и гражданина".

Л.Мери сообщил, что одной из задач правительства Эстонии в настоящее время является ускорение темпов натурализации неграждан. "Мы всегда очень внимательно относились к рекомендациям верховного комиссара ОБСЕ по правам человека в этом вопросе и выполнили почти все из них. Последними такими шагами были упрощение экзамена на получение эстонского гражданства и либерализация условий получения иностранцами видов на постоянное жительство", — отметил глава государства.

Президент высказался также за скорейшее привлечение Латвии и Литвы к началу переговоров об их вступлении в ЕС. "Если страны-кандидаты отвечают критериям ЕС, они должны получить возможность приступить к переговорам безотлагательно", — убежден Л.Мери.

Молдова

П.Лучинский: "Отношения многостороннего сотрудничества между странами СНГ не следует политизировать"

Президент Петр Лучинский считает, что сотрудничество органов безопасности и спецслужб стран СНГ необходимо прежде всего для обеспечения безопасности людей и экономической стабилизации, придания эффективности борьбе с преступностью в постсоветских государствах. Об этом он заявил на встрече с участниками заседания Совета руководителей органов безопасности и спецслужб (СОРБ) стран Содружества в Кишиневе.

В заседании принимали участие представители всех 12 стран СНГ. В центре внимания участников вопросы многостороннего сотрудничества стран СНГ в области борьбы с организованной преступностью и терроризмом, торговлей оружием и наркобизнесом, обеспечения ядерной безопасности.

Отметив, что без общих усилий невозможно эффективно бороться с негативными явлениями, президент подчеркнул, что отношения многостороннего сотрудничества между странами СНГ не следует политизировать. По его мнению, от этого все страны только выиграют. Независимо от уровня интеграции каждого государства в СНГ, любые отношения между странами должны основываться на уважении взаимных интересов, принципов независимости и суверенитета, подчеркнул П.Лучинский.

Стоп-кадр

У въезда в город Сенно привлекает к себе внимание уникальный памятник экологии. Здесь бьет родник, откуда берут воду не только местные жители, но и многие проезжающие.

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Армения

В рамках рабочего визита Тер-Петросяна в Париж ему присвоено звание почетного доктора Сорбонны

Президент Левон Тер-Петросян участвовал во главе делегации Армении в Страсбурге (Франция) в октябрьском саммите Совета Европы.

Армения имеет в Совете Европы статус особого приглашенного государства и в ближайшем будущем надеется стать полноправным членом этой организации.

По окончании форума СЕ президент Армении направился с рабочим визитом в Париж, где, в частности, провел переговоры с руководителем Франции Жаком Шираком.

В рамках визита состоялось присвоение Л.Тер-Петросяну звания почетного доктора Сорбонны, которого в свое время удостаивались выдающиеся политики, деятели науки и культуры, такие как Нельсон Мандела, Альберт Эйнштейн, Чарли Чаплин и др.

Как известно, Л.Тер-Петросян имеет научную степень доктора филологических наук, является автором 70 научных трудов по средневековой армянской литературе и армяноассирийским литературным связям. Кроме того, президент Армении — почетный доктор университетов Ла Верни (Италия) и Страсбурга (Франция), а также почетный член Азиатского общества Франции.

Украина

Кучма готов принять ряд решений по улучшению финансового состояния предприятий

Президент Леонид Кучма выразил готовность принять ряд решений, направленных на улучшение финансового состояния предприятий. Об этом он заявил в ходе посещения в Киеве центрального офиса банка "Украина" — одного из крупнейших в стране.

В частности, глава государства выразил готовность подписать указ, отменяющий очередность платежей, которая, по мнению специалистов, приводит к сокращению оборотных средств предприятий, вынуждая их проводить расчеты по бартеру.

Л.Кучма, согласившись с пожеланиями ряда своих собеседников, дал поручение подготовить законопроект об ипотечном кредитовании.

В ходе посещения банка Л.Кучма провел совещание, в котором, помимо ведущих финансистов Украины, приняли участие председатели колхозов, предприниматели.

Участники совещания подвергли резкой критике ранее принятое Верховным Советом постановление о введении пошлины на экспорт скота. По их мнению, реализация этого решения привела к потере Украиной рынков сбыта продукции животноводства и в конечном счете к его убыточности. "В следующем году Украина может превратиться в страну, импортирующую мясо", — заявил на совещании один из предпринимателей.

Казахстан

Н.Назарбаев: "К 2030 году Казахстан должен стать "центрально-азиатским барсом" и примером для других развивающихся стран"

Президент Нурсултан Назарбаев предложил парламенту утвердить кандидатуру 49-летнего Нурлана Балгимбаева на должность главы правительства республики.

Парламент одобрил предложенную президентом кандидатуру: за него единогласно проголосовали 50 депутатов нижней палаты парламента — мажилиса; 37 членов верхней палаты — сената — также поддержали это назначение при одном воздержавшемся.

В эксклюзивном интервью "Интерфаксу" Н.Балгимбаев заявил, что "политика правительства республики меняться не будет. Оно сохранит 100-процентную преемственность". Он назвал "полной неожиданностью" свое назначение на пост главы правительства.

"Я не имел морального права отказать главе государства", — заявил Н.Балгимбаев.

Как сообщили "ИФ" источники в Кабинете министров, ранее занимавший пост премьер-министра Акежан Кажегельдин и правительство подали в отставку. По мнению Н.Назарбаева, к 2030 году Казахстан "должен стать "центрально-азиатским барсом" и служить примером для других развивающихся стран".

Латвия

Парламент выступает против избрания президента всенародным голосованием

Президент Гунтис Улманис убежден, что Латвия в качестве члена Совета Европы накопила "большой опыт в области строительства демократии".

Такое заявление он сделал еще в Страсбурге, обращаясь к участникам совещания глав государств Совета Европы, сообщает корреспондент "Интерфакса".

По его словам, Рига и в дальнейшем будет использовать опыт европейских стран "в плане развития демократии в обществе".

Он напомнил участникам саммита СЕ, что еще год назад объявил мораторий на смертную казнь в Латвии, а "сейчас в обществе продолжается дискуссия на эту тему".

По словам Г.Улманиса, важно, чтобы в этом вопросе были приняты во внимание "не только вопросы законодательства стран ЕС, но и национальные интересы".

В качестве примера следования европейским стандартам, президент привел тот факт, что в Латвии "соблюдаются права национальных меньшинств и человека, а также нет этнических конфликтов". (Однако более 1/3 населения республики — так называемые "русскоязычные" — не имеют права на получение гражданства. — **"ИФ"**.).

При этом некоторые влиятельные круги в Евросоюзе ставят под сомнение соответствие политического устройства Латвии нормам ЕС. Определенное значение при этом сыграло и то, что латвийский парламент рассмотрел и отклонил предложение депутатов оппозиционного движения "Для Латвии", которое считает необходимым, чтобы президент избирался на всеобщих прямых, тайных и пропорциональных выборах.

Таким образом, в Латвии сохранится действующее по нынешнему законодательству положение, когда глава государства избирается депутатами парламента сроком на три года.

По материалам "Интерфакса"

Без грыфа "Сакрэтна"

Раскіданае гняздо, альбо Чаму беларускі Парыж знік з карты свету

У 1939—1941 гадах бальшавіцкая ўлада распаўсюдзіла сваю ганебную практыку гвалту і здзеку над сялянствам толькі што далучанай Заходняй Беларусі. Таталітарны молах знішчаў цэлыя вёскі, гінулі сотні, тысячы сем'яў самых лепшых хлебаробаў. Многія з населеных пунктаў так і не адрадзіліся. Такі ж горкі лёс напаткаў і заходнебеларускую вёсачку з дзіўнай назвай Парыж, амаль усе жыхары якой, пераважна гэта былі заможныя сяляне, падвергліся рэпрэсіям, ад вёскі засталася толькі назва...

Ужо восенню 1939 года парыжане нібы прадчувалі бяду. З недаверам прынялі яны "новы савецкі парадак", як і намеры ўлад распачаць "коллективизацию". І не памыліліся. Першым з Парыжа паспытаў на сабе механізм рэпрэсій 27-гадовы Вітольд Волк, які меў 6 класаў адукацыі, жонку, непаўнагадовага сына, неблагую ўласную гаспадарку. Яго 13 сакавіка 1940 года арыштоўваюць і хутка даюць 8 гадоў папраўча-працоўнага лагера. За што? За актыўныя антысавецкія размовы.

Тут трэба прыгадаць чытачам, што толькі даваенная бальшавіцкая машына рэпрэсій пазбавіла жыцця амаль 2 мільёны жыхароў Беларусі (дададзім сюды тых, каго "спісалі" на вайну). У адным толькі даваенным Дунілавіцкім раёне, куды адносілася вёска Парыж, людзей з падобным трагічным лёсам, як у Волка, налічваецца роўна 40. Усе яны трапілі ў кіпцюры НКУС.

Даведка. *Дунілавіцкі раён быў утвораны ў 1939 годзе пасля далучэння Заходняй Беларусі да СССР. Яго цэнтр размяшчаўся спачатку ў г.п.Дунілавічы, а з 1944 г. — у мястэчку Варапаева (з 1949 г. гарадскі пасёлак) Полацкай, у 1954—1960 гадах Маладзечанскай вобласці. Скасаваны ў 1960 г. Зараз тэрыторыя ў складзе Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці.*

Працэс рэпрэсій і прымусовай калектывізацыі быў, аднак, перапынены вайной, у час якой на акупіраванай тэрыторыі хутка зноў паўсталі аднаасобныя гаспадаркі. У першыя ж гады пасля Перамогі яны зноў трапілі ў пекла прымусу і гвалту. Дзесяцігоддзямі сцвярджалася, што большасць вяскоўцаў з ахвотай падтрымалі прымусовую калектывізацыю. Гэта ганебная мана, бо, як сведчаць дакументы, адказам на разбурэнне звычайнага сялянскага ўкладу ў заходніх раёнах Беларусі ў другой палове саракавых стаў сабатаж, знішчэнне асабістай жывёлы і нават узброеная барацьба.

Але вернемся ў тыя часы. На падставе архіўных даных, з якімі ўдалося пазнаёміцца, стала магчыма ўзнавіць асобныя моманты з тагачаснай палітыкі Саветаў у адносінах да сялянства. Побач з аднаўленнем калгасаў, створаных фарсіраваным парадкам перад вайной, улады пачалі шалёны наступ на заможных вяскоўцаў. Сігналам для атакі сталі пастановы Саўміна СССР №2881 ад 17 жніўня 1947 г. і Саўміна БССР №1200 ад 6 верасня таго ж года "Аб дадатковым абкладанні кулацкіх гаспадарак заходніх абласцей БССР". Яны прадугледжвалі асобы парадак падаткаабкладання: пры даходах да 10000 рублёў — 20 працэнтаў, ад 10 да 15 тысяч — 30% і звыш 15000 рублёў — ужо 50 працэнтаў.

У дасланых з Мінфіна БССР у раён тлумачэннях пад грыфам "ДСП" падрабязна ўказвалася, каго трэба лічыць кулаком. Дакумент, распрацаваны безадказнай савецкай бюракратычнай машынай, варты таго, каб яго працытаваць. Дык вось "да кулацкіх аднасяцца гаспадаркі, якія ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі або пасля яе:

а) выкарыстоўвалі пастаянна нанятых рабочых у сельскай гаспадарцы або промысле, за выключэннем выпадкаў найму працоўнай гаспадаркай аднаго падсобнага рабочага ў кавальскай справе і кустарнай вытворчасці колаў;

б) сістэматычна скарыстоўвалі працу аднаго і больш сезонных рабочых. Не з'яўляецца падставай для аднясення гаспадаркі да кулацкай, калі яна наймала пастуха з-за адсутнасці ў вёсцы грамадскага выпасу, або найманне аднаго падзённага рабочага ў перыяд сяўбы або масавай уборкі ураджаю, калі гэта было выклікана адсутнасцю ці недахопам працаздольных членаў сям'і, а таксама скарыстанне працы іншых гаспадарак на пачатках супрагі (працоўнай узаемадапамогі ў апрацоўцы зямлі батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак), калі апошняя не носіць кабальны характар;

в) выкарыстоўвалі працу іншых сялян на ўмовах адпрацоўкі замест прадастаўлення ім на кабальных умовах працоўнай жывёлы, насення, фуражу, прадуктаў харчавання або інвентару;

г) атрымоўвалі даходы ад выкарыстання ў іншых гаспадарках сельгасмашын за грашовую або натуральную аплату, а таксама на пачатках адпрацоўкі, мелі даход ад эксплуатацыі млыноў, маслабоень, крупадзёран, бульбяных, пладовых складоў або сушылак, іншых прадпрыемстваў, ад адкрытай арэнды зямлі, ад скупкі ўраджаю садоў або ягаднікаў з мэтай прамысловай перапрацоўкі, займаліся гандлем або ліхвярствам".

Менавіта гэты дакумент і прадвызначыў у далейшым лёс нашага Парыжа. У вёску неўзабаве прыбыў "адказны таварыш" для складання спісаў і характарыстык "кулацкіх" гаспадарак. Надта спяшаліся бальшавікі, бо ім загадвалася ўжо завяршыць работу і зацвердзіць гэтыя чорныя спісы ў нейкі там тыдзень да 15 верасня 1947 года. І ў апошні дзень адбылося лёсавызначальнае для парыжан пасяджэнне Дунілавіцкага райвыканкома з парадкам дня "Аб падатковым абкладанні кулацкіх гаспадарак у раёне". Як сведчыць захаваўшыйся пратакол гэтага пасяджэння, з якім мы пазнаёміліся, да "кулакоў" былі аднесены простыя сяляне, нястомныя працаўнікі з вёскі Парыж.

Першым у гэтым гаротным спісе названы Каспер Фарына. Вось які ён "класавы" вораг. Да нямецкай акупацыі і ў перыяд яе апрацоўваў 20 гектараў зямлі. З сакавіка 1946 па люты 1947 года меў работніцу Ванду Карпатка, сезонна працавалі Пётр і Станіслаў Юхновічы і Зофія Урублеўская, меў прыбытак ад сельгасмашын (колькі — не ўдакладнялася). А яшчэ меў 1,30 га раллі, паўтара гектара саду, двух коней і жаробку, дзве каровы і падцёлку, 12 авечак, 7 свіней.

А гэта яшчэ адзін парыжанін, тыповы беларускі "кулак" Антон Вярцінскі. У перыяд акупацыі меў 25 га зямлі, з 1945 года трымаў работнікаў Ванду Кадушкевіч і Віктара Ціхановіча. З 1946 года ў яго працавалі сезонна яшчэ два чалавекі. "Непрацоўныя" даходы меў ад коннай ільномялкі і малатарні, а яшчэ раллі 11 з паловай гектараў, саду — 60 сотак, жывёлы — 29 галоў разам.

Дарэчы, абодва мужыкі праз два гады пайшлі разам на этап, бо былі асуджаныя за невыкананне плана лесавывазкі. А ў 1951 годзе ўслед за гаспадарамі былі раскулачаны яшчэ дзве парыжанкі з аднайменнай вёскі — жонка Каспера Анна Фарына і Антона — Марыя Вярцінская. Сапраўды, бальшавіцкая дыктатура, як і любая іншая, не ведае жалю і сумнення.

А вось пра Іосіфа Шыцько з гэтай жа вёскі ў захаваўшыхся "кулацкіх справах" напісана зусім коратка. Пры немцах меў 40 га зямлі, у 1947 годзе — 10 га. Даходы ад сельгасмашын, жывёлы — 22 галавы разам.

Сумны гэты спіс можна працягваць яшчэ вельмі доўга. Колькасць раскулачаных, засведчаная дакументамі, толькі ў 1947—1952 гадах у адным толькі Дунілавіцкім раёне налічвае звыш 60 чалавек. Аднак невядома колькі такіх спраў не трапіла ў архіў. Лёсы астатніх парыжан, многіх іншых сем'яў у большасці сваёй былі падобнымі.

Абкладзеныя непасільнымі падаткамі, людзі не ў стане былі іх выплаціць. Прычым тэрмін уняцення падаткаў быў устаноўлены строгі: да 1 кастрычніка 1947 года. Падкрэслівалася, што ў выпадку нявыплаты меры прымусовага спагнання прымяняюцца неадкладна. Баронячыся ад расправы, мясцовыя парыжане, як і іншыя сяляне, пабеглі куды вочы глядзелі: на глухія вёскі і хутары, але галоўным чынам у гарады і ў Польшчу. У прыватнасці, у Варапаеве мелася некалькі прадпрыемстваў, на якія імкнуліся ўладкавацца ўцекачы. Нібыта нейкае жахлівае вяртанне сярэднявечча: як і тады гарадское паветра рабіла чалавека хоць крыху вальнейшым.

Кінутую людзьмі маёмасць уцекачоў у такім выпадку ўлады проста апісвалі, за нявыплату сельгасподатку гаспадароў за гэта судзілі па артыкуле 93, п. "Б", або па артыкуле 93/2 КК БССР за злоснае ўхіленне ад платы сельгасподатку. Калі маёмасць не была апісана, яе канфіскоўвалі, а сям'ю высялялі.

Прызнаемся, няпростыя пачуцці ўзнікаюць, калі чытаеш у архівах такія вось акты вопісаў канфіскаванай і нацыяналізаванай маёмасці. За 9 гадоў такія дакументы па раёне склалі больш чым на 220 чалавек. Большасць з гэтых "спраў" (каля 170) датавана 1950 годам, на які і прыпаў у нашай мясцовасці пік пераможнай "суцэльнай калектывізацыі".

Такім вось чынам неўзабаве і знікла з геаграфічнай карты свету беларуская вёска Парыж. Не дачакаліся мужыкі-парыжане абвешчанага бальшавікамі раю, новага светлага жыцця. Ды ці толькі адны яны такія? А ці назавеш шчаслівым сённяшняе жыццё ў слабеючых з кожным днём калгасах, за якія так трымаецца лукашэнкаўская ўлада? Калі ў нашы дні паўныя сілы імкнуцца перагледзець гісторыю і ўжо пачалі нанава перарабляць школьныя падручнікі, давайце памятаць, на чыім сумленні кроў, пакуты, зламаныя лёсы соцень тысяч бязвінных ахвяраў сістэмы.

Іосіф ЗЯМЧОНАК,
настаўнік Варапаеўскай сярэдняй школы,
Уладзімір ШЫК,
журналіст.
Віцебская вобласць.

Беларускі народны соннік

(Праця г. Пачатак у №№ 111, 114, 119, 126, 148, 153, 158, 168, 173, 178.)

Жывёлы

а) млекакормячыя

Калі цяжарнай самцы сняцца, сына мецьме.
Fed., s. 215.

Калі жануць тавар або авечкі — нехта з сваіх памрэ.
Pietkiewicz, s. 82.

Оўцы — сваты.
Moszynski, s. 152.

Авец сніць — будуць госці.
Серж., с. 39.

Барана бачыць — пампрэш. Таксама: ад глупства карысць будзе. **Авечку бачыць** — зімой адліга. Таксама: смерць. Таксама: блёўкаць будуць, — гамонка дзе-небудзь будзе пра тую, хто відзіць. **Добрых авечак, шлёнскіх бачыць** — пампрэць ад жабы хто.
Романов. Опыт, с. 67—68.

Барана бачыць — прыніжэнне: набляюцца людзі на цябе.
Ляцкий. Материалы, с. 147.

Барсука злавіць — неспадзяваная ўдача, радасць.
Васілеўскі, с. 11.

Быдла біць — нехта прыб'ецца. **Быдла выганяць з хлеву** — небяспека, рызыка.
Васілеўскі, с. 11.

Калі бабе на часох сніцца бык, то будзе ў ёй сын.
Fed., s. 212.

Бык як б'е, то чалавек дабіваецца да жэншчыны.
Moszynski, s. 150.

Быка тлустага — даход.
Васілеўскі, с. 12.

Калі валы прысняцца — енк, валане (кліч) неяко будзе.
Fed., s. 215.

Вол красны — балесць. **Вол сівы як сніцца дай коле рагамі** — добрэ: чалавек дабіваецца.
Moszynski, s. 153.

Валоў бачыць тлустых — багацце, **худых** — беднасць.
Васілеўскі, с. 12.

Гаўяда бачыць — клопат, **пасці** — якоесь няшчасце.
Серж., с. 39.

Ваўка бачыць — гоман, гаворкі будуць. Таксама: сваты будуць, калі маладому сніць. **А калі воўк штосьці ўцягне,** то вяселле будзе. Таксама: злоснік; калі чорны, дак з чорнымі валоссямі, а рыжы — дак з рыжымі — злоснік.
Романов. Опыт, с. 68.

Ваўка зловіш — урага зловіш.
Ляцкий. Материалы, с. 148.

Як сніцца, што воўк заступіў, то з некім важным гаварыць будзеш.

Як дзеўчыне прысніцца, то воўкі гоняць, а як усе сунуць, то кажуць, будуць сваты ўдавацца, а як адзін суне, да як дзе парве, укусіць, то ўжэ за таго пойдзе.

Воўк прысніцца, то гэта грэх.
Fed., s. 215.

Воўк — нядобра, нядуга.
Moszynski, s. 153.

Ваўка забіць — пазбудзешся клопату.
Васілеўскі, с. 12.

Воўка бачыць — шчасце.
Серж., с. 39.

Калі на святы дзяўчына сасніць ваўка (ці быка, барана, ці любую жывёлу мужчынскага полу) — будзе жаніх у хаце (Капыльскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 88, спр. 239-а, сш. 1, л. 5-а. Зап. *У.А.Васілевіч.*

Калі на Купалле сасняцца ваўкі — у гэты год выйдзеш замуж (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Воўк жаробку ўзяў — няўдача, страта.
Васілеўскі, с. 18.

Ваўчыную ляпу (пашчу) аглядаць — трывога, спатыкнешся з ворагам.
Васілеўскі, с. 23.

Вожыка бачыць — небяспека.
Романов. Опыт, с. 68.

Вожыка бачыць — навіна, **браць яго ў рукі** — непатрэбны клопат.
Васілеўскі, с. 16.

Жывёлу рэзаць — канец клопату.
Васілеўскі, с. 27.

Зайца бачыць — пагана. Таксама: падман.
Романов. Опыт, с. 68.

Зайца — кепска. Тое ж: купіш маёнтак: жаданне збудзецца.
Ляцкий. Материалы, с. 148.

Зайца — пажар.
Шейн, III, с. 340.

